## Сесія Выканаўчага савета ЮНЕСКА

**1 — 17 кастрычніка 2002 г.** У Парыжы ў штаб–кватэры ЮНЕСКА адбылася 165–я сесія Выканаўчага савета гэтай міжнароднай арганізацыі. У рабоце сесіі браў удзел Старшыня Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА Рэспублікі Беларусь У.Шчасны.

У ходзе сесіі Выканаўчы савет разгледзеў звыш 42–х пытанняў, найважнейшымі з якіх з'яўляюцца праект праграмы і бюджэту на 2004—2005 гг., удзел нацыянальных камісій па справах ЮНЕСКА ў ажыццяўленні Праграмы Арганізацыі, стварэнне новай міжнароднай праграмы ЮНЕСКА па фундаментальных навуках, праект рэкамендацый аб развіцці і выкарыстанні шматмоўя ў кіберпрасторы.

Дэлегацыя Беларусі правяла шэраг сустрэч з кіраўніцтвам ЮНЕСКА. Падчас гутаркі з Генеральным дырэктарам К.Мацуурам, якая прайшла ў цёплай дружалюбнай атмасферы, быў абмеркаваны шэраг канкрэтных сумесных дзеянняў па ажыццяўленні Мемарандума аб супрацоўніцтве паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і ЮНЕСКА, падпісанага ў ходзе нядаўняга візіту ў Беларусь кіраўніка Арганізацыі, у прыватнасці, распрацоўка праграмы ўстойлівага развіцця Палескага рэгіёну. Значная ўвага была нададзена разгляду супрацоўніцтва ў галіне навукі, адукацыі, захавання культурнай спадчыны, аховы навакольнага асяроддзя. Дасягнута дамоўленасць аб удзеле ЮНЕСКА ў правядзенні міжнароднага семінара, які збярэ інвестараў для ажыццяўлення праектаў па Палессю. Важным пытаннем, што абмяркоўвалася падчас сустрэчы, стаўся праект канвенцыі па нематэрыяльнай і вуснай спадчыне, распрацоўка і прыняцце якой падтрымліваецца Беларуссю. Генеральнаму дырэктару была ўручана памятная манета, выпушчаная з нагоды 200–гадовага юбілею Ігната Дамейкі і копія відэафільма аб візіце.

Адбылася сустрэча дэлегацыі Беларусі з намеснікам Генеральнага дырэктара ЮНЕСКА па пытаннях культуры М.Бушнакі. Ён быў азнаёмлены з захадамі беларускага боку дзеля забеспячэння сацыяльнага і эканамічнага развіцця мясцовасці на аснове ажыццяўлення праекта рэканструкцыі Мірскага замка, унесенага ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Адбыліся таксама сустрэчы з шэрагам іншых супрацоўнікаў Сакратарыята, падчас якіх былі абмеркаваны шляхі супрацоўніцтва Беларусі з ЮНЕСКА.